***Вераніка Анцілеўская***

**СЕМАНТЫКА АБРАДУ “КУСТ”**

У абрадавай культуры славян прыкметнае месца займае цыкл вясенне-летніх святаў, дзе галоўная роля адводзіцца каляндарнаму сімвалу, прама або апасродкавана звязанаму з раслінасцю. Цэнтральныя сімвалы святочных абрадаў носяць розныя імёны, адрозніваюцца спосабамі ўтварэння. Гэта то жывое дрэва, якое застаецца на сваім месцы, як траецкая бярозка, то ссечанае і прынесенае ў паселішча, як заходнееўрапейскае майскае дрэва, беларускі май (галінкі дрэў), украінскае клечанне і явір, то невялічкае ўпрыгожанае дрэўца, як польскі маек і гаек, а то належным чынам “апрануты” ў зеляніну чалавек. Ён можа быць хлопцам, як харвацкі зялёны Юрый (гэта ўжо больш позняя з’ява, пасля матрыярхату), дзяўчынкай (будучай маці), як украінская Таполя, як паўднёваславянская Пеперуда, руская Бярозка. Каляндарны сімвал мог прадстаўляцца лялькай, як, напрыклад, траецкая лялька, сямік і сямічыха ў рускіх. Часам ляльку выраблялі з бярозкі, прымацоўваючы ёй галаву і апранаючы ў жаночае адзенне, а часам – з саломы і рыззя, як семіка і семічыху. Каляндарныя сімвалы рознага выгляду маглі мець агульнае імя. Напрыклад, імя русалка надавалася апранутай у зеляніну або ў рыззё дзяўчынне, саламянай ляльцы, чучалу “каня” або “кабылы”, купала – дрэўцу, ляльцы, дзяўчыне ў зеляніне, вялікаму кійку, абкладзенаму саломай і канаплянай кастрыцай, з пукам саломы на версе. Маладосць і хараство падкрэсліваецца ў абрадавай дзеі не для марнатраўства, а для росквіту мацярынства.

Адмысловым каляндарным сімвалам з’яўляецца палескі Куст. Хранонім “Куст”, (“Куста”, “Кусто”) замацаваны за панядзелкам траецкага тыдня, радзей – за траецкай нядзеляй. Менавіта ў гэтыя дні адбываецца абрад ваджэння Куста. Вызначальныя рысы Куста – маладосць, дзявоцкасць, зялёная “вопратка”, а ў іншай версіі – убранне нявесты. Арыгінальная не сама постаць ахутанай зелянінай дзяўчыны, бо падобныя ёсць у іншых абрадах (Таполя, Бярозка, Купала), а загадкавае абрадавае імя “ Куст”, якое ў пераважнай большасці песенных твораў трывала звязваецца з клёнам. І сам Куст меў сімвал роду, продкаў.

Праведзенныя на кафедры этналогіі і фальклору (БДУКМ) па спецыяльнай распрацаваннай праграме палявыя даследванні (1989-2001гг.) дазволілі акрэсліць арэал абраду. Куст ахоплівае Піншчыну гістарычную і знаходзіцца ў асноўным на тэрыторыі Беларусі. Гэта сучасны Пінскі раён і часткова прылеглыя да яго тэрыторыі Іванаўскага, Лунінецкага, Івацэвіцкага, Столінскага раёнаў  а таксама в.Спорава Бярозаўскага раёна. Паўднёвая частка арэала абраду ахоплівае поўнач Зарэчнецкага і Дубровіцкага раёнаў Ровенскай вобл., Любяшоўскага раёна Валынскай вобласці. У мінулым арэал абраду Куст знаходзіўся ў межах адзінага дзяржаўнага ўтварэння (Турава-Пінскае княства), потым у адзіных адміністрацыйна-тэрытарыяльных утварэннях у ВКЛ, РП). Як паказала даследванне, абрад Куст у Беларусі і Украіне – адзіная па сваім паходжанні і функцыі з’ява.

Абрад куст святкаваўся на другі ці першы дзень Троіцы. Выкананню абраду папярэднічаюць траецкія дзяды (труйчаны, трыйцовые, троецкые). Абрад суадносіўся з днямі ўшанавання памерлых у чацвер пасля Тройцы: Навска Трыйца, Намська Труйца, Труйца умэрлых.

Абрад “Ваджэнне Куста”, прасякнуты магіяй і чысцінёй і выконвае маральную і эстэтычную функцыю. Эстэтыка чысціні арыентавана на выхаванне малодшага пакалення, аб’яднанне людзей [3]. Каб людзі цанілі сваіх продкаў, помнілі іх, каб іх душа не чарсцвела. Тут сэнс скіраванны на ўмацаванне сям’і– гэтае было галоўны клопат ў народзе. Абрад прасякнуты культам мацярынства Пад час абраду маладую, прыгожую дзяўчыну апраналі ў вопратку Куста. А паверх апраналі вяночак зробленны з галінак клёну. Вянок і вопратка сімвалізуюць прыгажосць прыроды, яе росквіт і росквіт маладой дзяўчыны. Паэтызацыя маральнай чысціні ў абрадзе спалучаецца з культурным табу – забаронай на парушэнне культурнай нормы паводзін.

Сцверджанне чыстага ідэалухарактэрна і для іншых веснавых абрадаў: “Ваджэнне русалкі”, “Паненскі вечар”, дзе маладой вянок з белых кветак робяць яе сяброўкі. Раса ў купальскім цыкле выконваечышчальную функцыю, пра гэта спяваецца ў шматлікіх песнях. Нашы продкі лічылі, што чысціня фізічная і духоўная – гэта ўвогуле натуральны стан чалавека.

Варта супаставіць запісы манер выканання народнай песні спевакамі розных пакаленняў, каб пераканацца ў глыбокай пранікнёнасці і духоўнасці носьбітаў традыцыі.

Мы маем запісаныя песні, якія выконваліся сучасным фальклорным гуртом і мясцовай старэнькай спявачкай. Манера маладых адрозніваецца ад манеры старых людзей. Старыя людзі спяваюць больш складана і гарманічна. У іх выкананні шмат мелізмаў, распеваў. Гэтыя песні гучаць прыгожа, ўзорыста. А сучасныя маладыя дзяўчаты і жанчыны спяваюць гэтыя ж песні без мелізматыкі, без распеваў [1]. Яны іх спрасцілі. Атрымліваецца, што раней песні былі больш складаннымі. І спявалі ў гармоніі, ніхто невыкрыкваў, слухалі адзін аднаго. Пра гэта яшчэ пісала беларуская фальклярыстка Марыя Косіч: “ нажаль можна заўважыць розніцу паміж спевамі 1860-70 і сучасныя часам (1880г), а менавіта: зараз несьпяваюць песні, а крычаць. Я ў харах, так і паасобку, кожная сіліцца крычаць ва ўсю сваю моц. І пры гэтым скажаеццца матыў песні.”[2, с. 232] Марыя Косіч жыла каля пасёлкі Расухі, Чарнігаўскай губерніі (сучасная Гомельская вобл.). Яна з самага маленства чула спевы жанчын. Яна не проста слухала, а таксама вучыла іх напамяць, спявала. Да пабудовы чыгуначнай дарогі, жанчыны спявалі спакайней, ніхто невыкрыкваў. І спявалі ў асноўным каляндарнаабрадавыя, пазаабрадавыя і сямейнародавыя песні. Яны мелі складаную

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

мелодыю. А пасля пабудовы чыгуначнай дарогі, маладыя сялянне сталі ездзіць у горад на працу. А, як прыязджалі назад, то прывозілі з сабой новыя песні – прыпеўкі. Прыпеўкі спявалі толькі маладыя, а старыя забаранялі іх спяваць, бо лічылі іх непрыстойнымі. І ўжо пасля 1870 года ўжо пачынала губляцца манера спеваў, тая гармонія, якая была раней [2, с. 232].

**Спіс літаратуры:**


1. Аўдыяматэрыялы з фальклорнай экспедыцыі пад кіраўніцтвам Пладуновай Т. А. ад Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, зладжаннай у 2013 г. (в. Камень, Пінскага р-ну, Брэсцкай вобл.).
2. Косіч, М. Н. Літвіны-белорусы Черніговской губерніі, іх быт і песні (1-ая кніга) / М. Н. Косіч. - Чернігов: Тіпографія Губернского Земства, 1903г. - 260 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ